Дзяменька Л.А.,
дацэнт

## ПУБЛІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ

У нашым грамадстве павышаецца цікавасць да праблемы адраджэння беларускай мовы, нацыянальнай культуры і ўвогуле беларускасці. Публічная бібліятэка павінна сказаць сваё пэўнае слова і ўнесці ўклад у гэтую справу. Шырокае кола задач было разгледжана на навукова-практычнай канферэнцыі «Бібліятэка і нацыянальная праграма «Спадчына», што адбылася ў Мінску ў 1991 г. па ініцыятыве Міністэрства культуры Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі.

Асноўнымі накірункамі, вызначанымі для бібліятэк, сталі пошук, захаванне і адраджэнне гістарычнай і культурнай спадчыны; падрыхтоўка насельніцтва да ўспрымання культурнай спадчыны.

Першы напрамак цалкам адпавядае прызначэнню бібліятэкі – быць скарбніцай не толькі агульначалавечых каштоўнасцей, але і нацыянальнай памяці народа. Ён рэалізуецца на практыцы праз фарміраванне фондаў нацыянальнымі дакументамі. Бібліятэкі, якія з'яўляюцца носьбітамі нацыянальнай памяці народа, павінны насіць імёны знакамітых пісьменнікаў, дзеячаў культуры ці навукі Беларусі. Але здарылася так, што з 90 бібліятэк у рэспубліцы, якім прысвоены імёны, толькі 1/3 носяць імёны нацыянальных дзеячаў. Затое 9 бібліятэк носяць імя А.С.Пушкіна, 7 – імя Н.К.Крупскай, 6 – імя А.М.Горкага, 6 – імя А.Гайдара, 4 – імя У.І.Леніна. Праўда, за апошні час адбыліся зме-ны. Полацкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы пры-своена імя Ф.Скарыны, верхнядзвінскай гарадской – імя Т.Хадкевіча, пружанскай раённай – імя паэта М.Засіма. З'яўляюцца бібліятэкі імя Ц.Гартнага, П.Галавача, М.Гарэцкага, К.Чорнага, М.Чарота, А.Куляшова, П.Глебкі і іншых вядомых беларускіх дзеячаў.

Другі накірунак дзейнасці звязаны з падрыхтоўкай насельніцтва да ўспрымання культурнай спадчыны народа і яе папулярызацыі. Пры бібліятэках працуюць курсы па вывучэнню беларускай мовы, ствараюцца тэатры кнігі, актывізуецца работа клубаў па інтарэсах, асабліва краязнаўчай тэматыкі, розных аматарскіх аб'яднанняў і таварыстваў. У іх праграмах – беларускія вячоркі, гадзіны цікавых паведамленняў, вечары сустрэч са знакамітымі землякамі, гасцёўні, урокі роднай мовы, гісторыі, прэм'еры і прэзентацыі кнігі, прэс-канферэнцыі і інш. Нярэдка члены аматарскіх таварыстваў займаюцца пошукавай работай. Напрыклад, у бібліятэках Магілёўскай вобласці (Круглянскай, Мсціслаўскай, Клімавіцкай, Горацкай) ідзе работа па збору мясцовых тапонімаў, дыялектных і фальклорных матэрыялаў населеных пунктаў, афармляюцца альбомы з запісамі абрадавых песень, прымавак, прыказак, якія бытуюць у сем'ях.

У апошні час больш цеснымі сталі сувязі публічных бібліятэк са сродкамі масавай інфармацыі. З'явіліся рэспубліканская тэлеперадача «Прэзентацыя кнігі», радыёчасопіс «Кніга ў тваім жыцці» (вядзе Пружанская раённая бібліятэка), тэлеперадача «На ніве адраджэння» (Брэсцкае абласное тэлебачанне). Узгзенская раённая бібліятэка сумесна з рэдакцыяй газеты «Чырвоная змена» арганізавалі працу літаратурнага аб'яднання «Нёманец», вынікам работы якога з'явілася выданне зборніка вершаў паэтаў Узгзеншчыны «Край мой родны, маляўнічы» (1993 г.).

Асаблівая ўвага надаецца дзіцячаму чытачу, ад якога ў будучым залежаць развіццё і захаванне нашай спадчыны. У арсенале бібліятэк – ранішнікі, гутаркі, агляды, выставы («З гісторыі роднага краю», «Роднай мовы чароўныя гукі», «Матчын ручнік» і інш.), фальклорныя святы, дні беларускай кнігі, конкурсы знаў-цаў беларускай мовы і традыцый, абрадавыя святы «Калядкі», «Купалле», «Гуканне вясны», «Масленіца».

Штуршком да актывізацыі дзейнасці публічных бібліятэк у напрамку нацыянальнага адраджэння стаў дзяржаўны конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», што быў аб'яўлены ў 1992 г. Беларускім фондам культуры. Удзел у конкурсе даў магчымасць публічным бібліятэкам павысіць змястоўнасць індывідуальнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, знайсці новыя формы папулярызацыі беларускай кнігі, краязнаўства сярод розных груп чытачоў, выкарыстаць нацыянальныя беларускія матывы ў афармленні бібліятэк. У розных рэгіёнах краіны сталі стварацца спецыялізаваныя бібліятэкі: бібліятэка-клуб, бібліятэка-музей, бібліятэка-краязнаўчы асяродак, бібліятэка-выставачная зала (Узгзенскі раён), бібліятэ-ка сямейнага чытання (бібліятэка N 7 г.Мінска, Клімавіцкая, Асіповіцкая раённыя бібліятэкі), з'явіліся разнастайныя спецыялізаваныя структурныя падраздзяленні ў межах існуючых цэнтралізаваных сістэм.

Шматбаковая дзейнасць публічных бібліятэк дае надзею на станоўчае вырашэнне праблемы нацыянальнага адраджэння на Беларусі, зразумела, ў цеснай сувязі з іншымі культурнымі і асветніцкімі ўстановамі.

Карасцінская Н.У.,
саіскальнік

## НЕКАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ І.Б.СІМАНОЎСКАГА Ў ГАЛІНЕ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ

У сучасны момант ідзе актыўны пошук павышэння бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк Беларусі ў сувязі з палітычнымі, эканамічнымі і сацыякультурнымі зменамі ў нашай дзяржаве. Але навацыі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

безумоўна, павінны абапірацца на станоўчыя традыцыі і веды, якія былі назапашаны папярэднімі пакаленнямі бібліятэкараў і бібліёграфаў. З гэтага пункту гледжання заслугоўвае увагі вывучэнне тэарэтычнай спадчыны ў галіне бібліяграфіі вядомага дзеяча кнігі І.Б.Сімаоўскага, які ўсё сваё жыццё прысвяціў бібліятэчнай справе і бібліяграфіі Беларусі.

Засяродзім увагу на поглядах І.Б.Сімаоўскага па пытаннях сутнасці бібліяграфіі, яе функцыянальнай і відавой структуры. Застаючыся на пазіцыях кваліфікацыі бібліяграфіі як кнігазнаўчай дысцыпліны, характэрных для большасці бібліёграфаў 20--30 гг. нашага стагоддзя, І.Б.Сімаоўскі зводзіў сутнасць бібліяграфіі да бібліяграфічнага метаду. Аб гэтым сведчыць яго выказванне на І Усерасійскім бібліяграфічным з'ездзе, дзе ён гаварыў аб бібліяграфічным метадзе як асноўным для кнігазнаўства, бібліятэказнаўства, практычнай бібліяграфічнай дзейнасці, выкладчыцкай, навукова-даследчай работы і нават арганізацыі інтэлектуальнай працы.

На такіх пазіцыях, але больш вузкіх знаходзіліся А.С.Чубар'ян, С.А.Трубнікаў, Ю.М.Тугаў. Імі ставілася пытанне аб рэкамендацыйнай бібліяграфіі як метадзе кіраўніцтва чытаннем.

Разважанні І.Б.Сімаоўскага аб бібліяграфічным метадзе шмат гадоў апасля знайшлі падтрымку ў канцэпцыі М.Г.Вохрышавай, якая зрабіла выснову, што ён з'яўляецца агульнанавуковым.

Думкі І.Б.Сімаоўскага сугучны і сучаснаму даследаванню тэорыі бібліяграфіі Н.А.Сляднёвай. Яна ў манаграфіі «Бібліяграфія ў сістэме універсума чалавечай дзейнасці» сутнасць бібліяграфіі бачыць ў прымяненні бібліяграфічнага метаду ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці.

Вылучаючы такія функцыі бібліяграфіі, як інфармацыйная, пошукавая, кансультацыйная, палітычна-асветніцкая, навукова-дапаможная, крытыказнаўчая, І.Б.Сімаоўскі не падзяляе іх на два ўзроўні ў адпаведнасці з сучасным вучэннем функцыянальнай структуры бібліяграфіі.

Разглядаючы галіновую навукова-дапаможную бібліяграфію, асабліва па гуманітарных дысцыплінах, І.Б.Сімаоўскі яшчэ ў 1965 годзе прыйшоў да высновы, што яна выконвае крытыказнаўчую функцыю. У 70--80 гады даследчыкі, напрыклад Я.М. Малевіч, вывучаючы гістарычную бібліяграфію, робяць вывад, што адной з важнейшых функцый яе з'яўляецца крытыказнаўчая. У артыкуле В.А Факеева «Да пытання аб крытыказнаўчай фукцыі бібліяграфіі» гэта думка атрымала дэталізаванае навуковае абгрунтаванне. Ён паказвае шляхі і метады яе рэалізацыі ў навукова-дапаможнай бібліяграфіі ўвогуле і асабліва ў бібліяграфічных працах гуманітарнага характару.

Вывучаючы функцыянальную структуру бібліяграфіі на сучасным этапе, Н.А.Сляднёва і І.С.Шышкін сярод спецыфічных функцый бібліяграфіі вызначылі таксама і крытыказнаўчую.

Цікавымі з'яўляюцца погляды І.Б.Сімаоўскага і на ўзроўні бібліяграфавання. У сваёй манаграфіі «Беларуская савецкая бібліяграфія» (Мінск, 1965) ён шырока даследуе, так бы мовіць, «латэнтную» і «афінную» бібліяграфічную інфармацыю, а таксама, калі выкарыстаць тэрміналогію Н.А.Сляднёвай, «постідыцыйную».

Прагрэсіўнымі з'яўляюцца і думкі І.Б.Сімаоўскага аб аб'екце бібліяграфіі, да якога ён адносіў не толькі друкаваныя творы, але і рукапісныя кнігі, дысертацыі і іншыя сацыяльна значныя дакументы. Гэта сведчыць аб тым, што ён прытрымліваўся дакументальнага падыходу да аб'екта бібліяграфіі.

Такім чынам, сказанае намі дае падставу зрабіць выснову, што тэарэтычныя погляды І.Б.Сімаоўскага сугучны сучаснай парадыгме бібліяграфазнаўства.

Фядорына А.І.,
ст.выкладчык

## ДА ПЫТАННЯ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧАЙ ДУМКІ НА БЕЛАРУСІ Ў 50-я ГАДЫ

Працэс дэмакратызацыі, які шырока разгарнуўся з сярэдзіны 50-х гадоў, стварыў спрыяльныя умовы для развіцця культуры, у тым ліку і бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь. У гэты час плённа працавалі тэарэтыкі і практыкі. Іх погляды былі адлюстраваны ў выступленнях і публікацыях.

Асноўным тэарэтычным пытаннем у развіцці бібліятэчнай справы трэба лічыць вызначэнне функцый бібліятэк. Увага бібліятэказнаўчай думкі 50-х гадоў на Беларусі была накіравана на далейшую распрацоўку функцый бібліятэк. У прафесійным друку дыскутаваліся розныя пункты гледжання наконт ролі бібліятэк у самаадукацыі. Так, К.Г.Маўрычава лічыла, што самаадукацыя ёсць спосаб набыцця адукацыі і паміж самаадукацыяй і школьнай адукацыяй няма прынцыповай розніцы. Але вузкае паняцце самаадукацыі як разнавіднасці школьнага навучання не было падтрымана шэрагам бібліятэказнаўцаў і бібліёграфаў: З.Э.Лус, В.Г.Оліпавым, Б.А.Смірновай і інш.

У гэты ж перыяд паспела неабходнасць удакладнення тыпалогіі абласных бібліятэк. І.Б.Сімаоўскі на навуковай канферэнцыі (снеж.1975 г., Масква) падкрэсліў, што абласныя бібліятэкі павінны заняць «своё надлежащее место среди научных библиотек» і выконваць функцыю «основной научной библиотеки». Пазіцыя І.Б.Сімаоўскага супрацьстаяла пунктам гледжання тых бібліятэказнаўцаў, якія адносілі абласныя бібліятэкі да масавых. Навуковы падыход тэарэтыка бібліятэчнай справы Беларусі да абласных бібліятэк з'яўляецца правільным і перспектыўным і ў нашы дні.